# «Крыніцы гістарычнай памяці»: *дзе і калі можна паглядзець*

Нацыянальная бібліятэка Беларусі запрашае на новыя сустрэчы з вядомымі навукоўцамі ў межах цыкла «Крыніцы гістарычнай памяці». Лекцыі адбываюцца кожны тыдзень у адкрытым для публікі фармаце і на бясплатнай аснове, а таксама суправаджаюцца жывой анлайн-трансляцыяй.

**2 лютага** а 15-й гадзіне – лекцыя «**Графіці Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы**». Сярод пытанняў: Ці можна было пісаць на сценах царквы? Як звалі ігуменняў, якія былі пасля Ефрасінні Полацкай? Які грэх найчасцей узгадваецца ў графіці Спаса-Праабражэнскай царквы? Ці «пасцілі» ў Сярэдневякоўі коцікаў на сценах? Спасылка на трансляцыю: https://youtu.be/Lgc71tqRjl8.

**Эксперт** – Іна Калечыц, кандыдат гістарычных навук, дацэнт БДПУ імя Максіма Танка; з 2007 г. удзельнік рэстаўрацыйных і навукова-праектных работ Спасаўскай царквы ў Полацку, ведае ўсё пра 4 000 унікальных графіці царквы.

**9 лютага** а 15-й гадзіне – лекцыя «**Беларусь на старажытных картах**». Сярод пытанняў: Калі ўпершыню на картах з'яўляюцца беларускія землі? Ці ведаў Пталемей пра Беларусь? Калі з'явіліся першыя карты з тапонімам «Белая Русь»? На падставе чаго тэрыторыі дзяржаў і земляў вылучалі на даўніх картах рознымі колерамі? Спасылка на трансляцыю: https://youtu.be/bHjmNiuhML8.

**Эксперт** – Леў Казлоў, кандыдат гістарычных навук, вядомы даследчык старажытных беларускіх карт, гісторык, перакладчык; аўтар фундаментальных прац па гісторыі беларускай картаграфіі, складальнік гістарычных атласаў і збораў даўніх карт, аўтар рэканструкцыі шэрага старажытных карт, атласаў і глобусаў (у Мінскай ратушы, у Нясвіжскім палацы і інш.).

**16 лютага** а 15-й гадзіне – лекцыя «**Адлюстраванне гістарычнай памяці ў назвах вуліц Мінска**». Сярод пытанняў: Пра што расказваюць назвы вуліц Мінска? Якія найменні дамінуюць у беларускай сталіцы? Ці істотна змяніліся назвы вуліц Мінска за апошнія 100 – 200 гадоў? Ці можа тапанімія спрыяць выхаванню патрыятызму? Якіх назваў вуліц не хапае беларускай сталіцы? Як прысвойваецца найменне вуліц? Спасылка на трансляцыю: https://youtu.be/_CP0IIFEknY.

**Эксперт** – Іван Сацукевіч, член камісіі па найменаванні і перайменаванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых састаўных частак Мінска пры Мінгарвыканкаме, гісторык, выкладчык, экскурсавод, даследчык гісторыі Мінска, аўтар шматлікіх публікацый пра беларускую сталіцу.

**23 лютага** а 15-й гадзіне – лекцыя «**Аператыўныя і выведвальныя зводкі Беларускага штаба партызанскага руху**». Сярод пытанняў: Што рабілі ў беларускіх лясах дыверсанты з Іспаніі? Дзе нямецкія спецслужбы адкрывалі шпіёнскія школы і каго туды вербавалі? У чым асаблівасць і ўнікальнасць корпуса справаздачных дакументаў БШПД? Як фармавалася справаводства і дакументаабарот у фарміраваннях «лясных салдат» і кіруючым штабе? Які інфарматыўны і навуковы патэнцыял выніковых зводак БШПД, шлях іх увядзення ў навуковы абарот? Спасылка на трансляцыю: https://youtu.be/ZSUPDBj_rwg.

**Эксперт** – Святаслаў Кулінок, кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, аўтар больш за 160 навуковых публікацый, спецыяліст па гісторыі і крыніцазнаўстве Вялікай Айчыннай вайны.

***Паводле паведамлення НББ***